Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па навуковай рабоце
БДУКМ
_____________ В. Р. Языковіч
«____» ___________ 2019 г.
Рэгістрацыйны № ВД-________/вуч.

# КЛАСІЧНЫ ТАНЕЦ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-17 02 01 Харэаграфічнае мастацтва (па напрамках),*
*напрамкаў спецыяльнасці*
*1-17 02 01-04 Харэаграфічнае мастацтва (народны танец),*
*1-17 02 01-05 Харэаграфічнае мастацтва (бальны танец),*
*1-17 02 01-06 Харэаграфічнае мастацтва (эстрадны танец),*
*1-17 02 01-10 Харэаграфічнае мастацтва (сучасны танец)*

2019

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вучэбная праграма распрацавана на падставе адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі ОСВО 1-17 02 01-2013, вучэбных планаў установы вышэйшай адукацыі па напрамках спецыяльнасцей 1-17 02 01-04 Харэаграфічнае мастацтва (па напрамках)

**СКЛАДАЛЬНІК**
*В. В. Лысянкова*, дацэнт кафедры харэаграфіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*М. В. Філатава*, прафесар кафедры майстэрства акцёра ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў»;
*І. І. Бадунова,* дацэнт кафедры харэаграфіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
кафедрай харэаграфіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 8 ад 22.03.2017 г.);
прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 14.12.2017 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: В. В. Лысянкова

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Класічны танец» з’яўляецца важнай часткай прафесійнага навучання будучых педагогаў-харэографаў на кафедры харэаграфіі. Яна разлічана на чатыры гады навучання і спалучае тэарэтычныя і практычныя заняткі.

Тэарэтычная частка вучэбнай дысцыпліны знаёміць студэнтаў з развіццём сістэмы класічнага танца, методыкай пабудовы і правядзеннем заняткаў класічнага танца, музычным афармленнем камбінацый і развіццём музыкальнасці, са спецыфікай работы ў аматарскіх калектывах розных напрамкаў (народнага танца, эстраднага танца, бальнага танца, сучаснага танца і інш.).

Асноўная *мэта* практычнай часткі – авалоданне методыкай педагагічнай, пастановачнай і рэпетыцыйнай работы ў вобласці класічнага танца, набыццё неабходных спецыфічных выканальніцкіх уменняў і навыкаў, раскрыццё ў працэсе заняткаў творчага патэнцыялу студэнта, фарміраванне ўстойлівай цікавасці да танца.

*Задачы* вучэбнай дысцыпліны:

– раскрыць сутнасць класічнага танца як віду мастацтва;

– раскрыць сутнасць вывучэння методыкі класічнага танца як вучэбнай дысцыпліны ў прафесійным навучальным працэсе;

– навучыць студэнтаў розных напрамкаў спецыяльнасці выкарыстоўваць сістэму класічнага танца як сродак выразнасці;

– прывесці прыёмы и прыклады работы з класічным танцам у аматарскіх калектывах розных напрамкаў (народнага танца, эстраднага танца, бальнага танца, сучаснага танца і інш.);

– выхаванне творчай актыўнасці і самасвядомасці ў працэсе навучання (фарміраванне прафесійнай цікавасці).

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны спецыялісты павінны *ведаць:*

– педагагічную сістэму А. Я. Ваганавай;

– асноўныя патрабаванні да класічнага танца;

– прынцыпы падбору музычнага матэрыялу для ўрокаў класічнага танца;

– прынцыпы музычнага выхавання і развіцця музыкальнасці на занятках класічнага танца;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*умець:*

– выконваць асноўныя рухі класічнага танца;

– граматна і прафесійна падыходзіць да вывучэння школы класічнага танца;

– улічваць спецыфіку правядзення ўрока класічнага танца ў калектывах рознай накіраванасці і розных узроставых катэгорый;

– развіваць у выканаўцаў навыкі валодання лексікай класічнага танца;

– развіваць творчыя здольнасці ўдзельнікаў танцавальных калектываў сродкамі класічнага танца;

– супрацоўнічаць з канцэртмайстрам пры падборы музычнага матэрыялу;

*валодаць:*

– асноўнай тэрміналогіяй класічнага танца;

– методыкай вывучэння і выканання рухаў класічнага танца;

– методыкай пабудовы і правядзення ўрока класічнага танца ў калектывах рознай накіраванасці (народнага, эстраднага, бальнага танца і інш.) і для розных узроставых катэгорый.

Вучэбная дысцыпліна «Класічны танец» знаходзіцца ў цеснай узаемасувязі з іншымі спецыяльнымі харэаграфічнымі дысцыплінамі (харэаграфічны трэнаж, дуэтна-сцэнічны танец, народна-сцэнічны танец, эстрадны танец, джаз-танец, бальны танец, кірункі сучаснай харэаграфіі, мастацтва балетмайстра і інш.) і з’яўляецца асновай прафесійнага выканальніцкага майстэрства.

Засваенне вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне «Класічны танец» павінна забяспечыць фарміраванне наступных груп кампетэнцый.

**Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі**:

САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-4. Валодаць навыкамі здаровага ладу жыцця.

САК-6. Умець працаваць у камандзе.

САК-11. Актыўна ўдзельнічаць у творчых мерапрыемствах як мясцовага (студэнцкія навуковыя грамадствы), так і агульнанацыянальнага (фестывалі, пленумы і г. д.) значэння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Прафесійныя кампетэнцыі:**

*Выканальніцкая дзейнасць*

ПК-1. Выкоўваць харэаграфічную лексіку розных відаў танца.

ПК-3. Працаваць з рознымі крыніцамі для стварэння рэпертуару, літаратурай па харэаграфіі.

ПК-7. Ведаць рэпертуар харэаграфічнага калектыву і валодаць методыкай яго выканананння.

*Пастановачная і рэпетыцыйная дзейнасць*

ПК-14. Фарміраваць выканальніцкую, эстэтычную і маральную культуру танцоўшчыка.

*Культурна-асветніцкая дзейнасць*

ПК-30. Удзельнічаць у падрыхтоўцы і правядзенні мерапрыемстваў па прапагандзе духоўных і маральных каштоўнасцей і ідэалаў айчыннай культуры, узораў харэаграфічнага мастацтва і беларускага харэаграфічнага фальклору ў сродках масавай інфармацыі і камунікацыі.

Вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Класічны танец» прадугледжана 898 гадзін, у тым ліку 408 гадзін аўдыторных заняткаў. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: для напрамкаў спецыяльнасці «харэаграфічнае мастацтва (народны танец)», «харэаграфічнае мастацтва (эстрадны танец)», «харэаграфічнае мастацтва (сучасны танец)» – 24 гадзіны – лекцыі, 360 гадзін – лабараторныя, 24 гадзіны – індывідуальныя; для напрамку спецыяльнасці «харэаграфічнае мастацтва (бальны танец)» прадугледжана 754 гадзіны, у тым ліку 326 гадзін аўдыторных заняткаў, з іх: 6 гадзін – лекцыі, 296 гадзін – лабараторныя, 24 гадзіны – індывідуальныя.

Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў студэнтаў – залікі, экзамены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### Раздзел I

*Тэма 1. Фарміраванне і развіццё сістэмы класічнага танца*

Працы П. Бошана і Р. Фее ў французскай каралеўскай акадэміі танца.

Развіццё сістэмы класічнага танца ў Расіі.

Аснова, на якой узнік «язык» класічнага танца – сама прырода чалавека, арганіка яго руху, творчае ўяўленне, эмацыянальнасць, любоў і імкненне да высакароднага, благароднага, узвышанага, што выкарыстоўвае ў сваёй танцавальнай творчасці народны, а затым балетны тэатр.

Выразныя сродкі класічнага танца. Стварэнне рускай школы класічнага танца. Адметныя рысы рускай школы, яе выканальніцкага майстэрства.

Развіццё і ўзбагачэнне тэорыі і методыкі выкладання класічнага танца.

*Тэма 2. Асноўныя патрабаванні да класічнага танца*

Вываратнасць, яе эстэтычныя функцыі. Наяўнасць вываратнасці як асноўнае патрабаванне пры выкананні рухаў класічнага танца. Пастава ў класічным танцы. Эстэтычныя функцыі паставы. Неабходнасць правільнай паставы для выканання рухаў класічнага танца. Апломб у класічным танцы. Пліе ў класічным танцы. Мяккасць і гібкасць ног, пластыка і гібкасць цела як сродкі выразнасці выканаўцы. Танцавальны крок – адно з асноўных патрабаванняў да класічнага танца. Развіццё навыкаў танцавальнага кроку на ўроках класічнага танца. Скачок у класічным танцы. Асаблівасці выканання скачкоў у жаночым і мужчынскім танцы. Класічны танец і музыка. Музыкальнасць танцоўшчыка.

*Тэма 3. Развіццё музыкальнасці на ўроку класічнага танца*

Паняцці «рытм», «метр», «тэмп», «музыкальная дынаміка». Мелодыя і яе мастацкае ўвасабленне ў танцавальных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

камбінацыях. Музыкальнасць і выразнасць рухаў класічнага танца. Стварэнне і выкананне асобных камбінацый у адпаведнасці са структурай і характарам музычнага твора. Стварэнне танцавальных камбінацый на прапанаваныя музычныя прыклады. Лекцыя суправаджаецца практычнымі прыкладамі. На наступных практычных занятках студэнты набываюць навыкі складання асобных камбінацый на зададзены музычны матэрыял.

### *Методыка вывучэння рухаў класічнага танца*

*Экзерсіс ля станка*

**1**. Пастаноўка корпуса.

**2**. Пазіцыі ног – I, II, III, V, IV. Пазіцыі рук: падрыхтоўчае палажэнне, I, III, II.

**3**. Demi-plié ў I, II, III, V, пазней – у IV пазіцыі.

**4**. Grand-plié ў I, II, III, V пазіцыях, у IV пазіцыі.

**5**. Battement tendu: а) з I пазіцыі; б) з demi-pliés у I пазіцыю; в) з V пазіцыі; г) з demi-plié ў V пазіцыю; д) з апусканнем пяткі ў II пазіцыю.

**6**. Passé par terré (правядзенне нагі ўперад і назад праз I пазіцыю.

**7.** Паняцце кірункаў en dehors et en dedans.

**8.** Demi rond de jambe par terré en dehors et en dedans.

**9**. Rond de jambe par terré en dehors et en dedans, затым на demi-plie.

**10**. Battement tendu jeté: а) з I і з V пазіцый; б) з demi-pliés у I і V пазіцыі; в) piqués; г) balancoir; д) са згібам пад'ёму працуючай нагі на 25°–30°.

**11**. Preparation для rond de jambe par terré en dehors et en dedans.

**12**. Абхватнае становішча нагі sur le cou-de-pied. Battement frappé, battement double frappé: а) наском у падлогу; б) на 30°; в) на паўпальцах.

**13.** Relevés на паўпальцы ў I, II і V пазіцыях з выцягнутых ног, з demi-plié.

**14**. Умоўнае становішча нагі sur le cou-de-pied. Battement fondu: а) наском у падлогу; б) на 45°; в) на паўпальцах.

**15**. I і III port de bras (III port de bras з нагой, выцягнутай на насок уперад або назад, а таксама з demi-plié на апорнай назе).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**16.** Battement soutenu: а) наском у падлогу; б) затым на 45°; в) на паўпальцах.

**17**. Petit battement sur le cou-de-pied: а) з раўнамерным пераносам нагі; б) з акцэнтам уперад, назад; в) на паўпальцах.

**18**. Battement relevé lent: з I пазіцыі, з V пазіцыі, на 45°, на 90°.

**19**. Grand battement jeté: з I пазіцыі; з V пазіцыі, pointé (piqué).

**20**. Battement retiré з V пазіцыі, у становішча sur le cou-de-pied і на 90° да калена апорнай нагі і зварот у V пазіцыю праз passé на 90°.

**21.** Battement developpé: а) з V пазіцыі; б) demi rond de jambe developpe на 90°; в) passé на 90° на паўпальцах.

**22**. Rond de jambe en l'air en dehors et en dedans (вывучэнне пачынаецца з згібання і разгібання нагі на 45°): а) на ўсёй ступні; б) demi rond de jambe на 45° en dehors et en dedans на ўсёй ступні; в) на паўпальцах.

**23**. Перагібанні корпуса назад і ўбок (тварам да станка).

**24.** Pas tombé ў V пазіцыі ўперад, назад – другая нага на cou-de-pied.

**25.** Pas coupé: а) на ўсю ступню; б) на паўпальцы.

**26.** Petit temps relevé 45°: а) на ўсю ступню; б) на паўпальцы на 45°.

**27.** Pas de bourrée simple (з пераменай ног), pas de bourrée suivi на паўпальцах.

**28.** Relevé на паўпальцы з працуючай нагой у паставе sur le cou-de-pied.

**29**. Паўпавароты ў V пазіцыі да станка і ад станка на дзвюх нагах з пераменай ног на паўпальцах: а) з выцягнутых ног; б) з demi-plié.

**30**. Маленькія позы croisée, effacée, ecartée ўперад і назад, II arabesque па меры засваення ўводзяцца ў розныя камбінацыі. Спачатку вывучаюцца наском у падлогу, у канцы года з пад'ёмам на 45°, затым на 90°.

*Экзерсіс на сярэдзіне зала*

**1**. Паклон. Пазіцыі рук: падрыхтоўчае становішча, I, III, II.

**2.** Паняцце épaulement. Épaulement croisé et effacé. Позы croisée, effacée ўперад і назад наском у падлогу на выцягнутай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

назе і на demi-plié ў другім семестры з нагой, паднятай на 45° і на 90°. Поза ecarté вывучаецца пазней.

**3.** I, II, III arabesques наском у падлогу, з нагой, паднятай на 45° і на 90°. IV arabesque наском у падлогу.

**4.** Demi-plié, Grand-plié ў I, II, V пазіцыях, en face, у IV пазіцыі épaulement.

**5.** Battement tendu: а) з I, V пазіцый па ўсіх напрамках; б) з demi-plies у I, V пазіцыях па ўсіх напрамках; в) з demi-pliés у II і IV пазіцыю без пераходу з апорнай нагі і з пераходам на другую нагу; г) з passé par terre; д) з апусканнем пяткі ў II пазіцыю; е) у позах.

**6.** Battement tendu jeté: а) з I, V пазіцый па ўсіх напрамках; б) з demi-pliés у I, V пазіцыю па ўсіх напрамках; в) piqués; г) у позах.

**7.** Demi rond de jambe par terre, Rond de jambe par terre en dehors et en dedans.

**8.** Preparation да rond de jambe par terré (temps releve par terré) en dehors et en dedans.

**9**. Battement frappé, doubles frappé: а) наском у падлогу; б) на 30°; в) у позах.

**10.** Battement fondu: а) наском у падлогу; б) на 45°; в) у позах.

**11**. Battement soutenu: а) наском у падлогу; б) на 45°; в) у позах.

**12**. Petit battement sur le cou-de-pied раўнамерна, з акцэнтам уперад і назад en face, затым épaulement.

**13.** Battement relevé lent: а) з I і V пазіцый en face; б) у позах croisee, effacée, пасля ecartée; в) у I, II і III arabesques.

**14.** Battement developpé: а) en face; б) у позах croisée, effacée, пасля ecartée; I, II, III arabesques; в) праз passé на 90° en face і ў позах.

**15.** Grand battement jeté: а) з I і V пазіцый en face; б) pointés en face, у позах.

**16.** Поза attitude effacé і croisé ўперад, назад.

**17**. Temps lie par terre. Temps lie par terre с port de bras.

**18**. Rond de jambe en l'air en dehors et en dedans.

**19.** Pas tombé ў V пазіцыю (другая нага на sur le cou-de-pied). Pas coupé.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**20**. I, II, III port de bras. III port de bras з нахілам корпуса ўбок.

**21.** Preparation да rond de jambe en l'air (temps relevé на $45^0$) en dehors et en dedans.

**22**. Relevés на паўпальцы ў I, II, V пазіцыях з demi-plié, з выцягнутых ног.

**23.** Pas de bourrée з пераменай ног en face, у épaulement, без перамены ног з боку ўбок: а) наском у падлогу; б) на 45°.

**24.** Pas de bourrée suivi en face на месцы, затым з прасоўваннем убок.

**25.** Паўпавароты на дзвюх нагах у V пазіцыі з пераменай ног, пачынаючы з выцягнутых ног і з demi-plié.

*Allegro*

**1**. Temps leve sauté па I, II, V, IV пазіцыі. Changement de pied.

**2**. Petit pas echappé па II пазіцыі, па IV пазіцыі.

**3.** Pas assemblé па ўсіх напрамках en face; у позах.

**4**. Pas glissade па ўсіх напрамках; у позах.

**5.** Sissonne simple en face, у позах.

**6**. Sissonne fermé en face ўбок, уперад, назад, у позах.

**7.** Petit pas chassé en face ўперад, убок, назад, пасля – у позах.

**8**. Sissonne tombé en face, у другім семестры – у позах.

**9**. Pas jeté з адкрываннем нагі ўбок en face, з заканчэннем у épaulement.

**10**. Sissonne ouverte па ўсіх напрамках en face; у позах.

**11.** Pas balancé з боку ўбок.

**12**. Pas de basque ўперад (сцэнічная форма).

**13.** Сцэнічны sissonne ў I arabesque, Pas couru (уперад, назад) па дыяганалі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел II

*Тэма 4. Прынцыпы падбору музычнага матэрыялу да ўрока класічнага танца*

Роля музычнага суправаджэння на занятках класічнага танца. Праслухоўванне і аналіз музычных прыкладаў. Падбор музычных прыкладаў з улікам узроставых асаблівасцей вучняў і характару танцавальных рухаў.

*Тэма 5. Этапы пабудовы ўрока класічнага танца ў аматарскім калектыве*

Задачы ўрока класічнага танца. Тэрміналогія класічнага танца. Паслядоўнасць выканання экзерсісу каля станка і на сярэдзіне зала. Суразмернасць працягласці частак урока. Тэмп урока.

Увесь працэс вучэбнай работы трэба будаваць так, каб ён насіў творчы, мэтанакіраваны характар. Вялікую ўвагу варта надаваць развіццю каардынацыі рухаў. У аматарскім калектыве невялікая колькасць заняткаў, таму методыка выкладання і правільная пабудова ўрока, размеркаванне часу, тэмп урока маюць вельмі важнае значэнне.

Спецыфіка работы педагога-харэографа ў аматарскіх калектывах не дазваляе абмежаванняў ва ўзросце, што складае асноўную цяжкасць вучэбнай і выхаваўчай працы педагога класічнага танца. Зыходзячы з гэтага, увесь навучальны матэрыял можна падзяліць на тры часткі: вывучэнне асноў школы класічнага танца (што дае магчымасць выявіць здольнасці навучэнца); удасканаленне і далейшае авалоданне законамі школы класічнага танца на аснове атрыманых ведаў; пастаяннае ўдасканаленне тэхнікі класічнага танца і яго выразнасці пры максімальным развіцці індывідуальных здольнасцей навучэнца.

### ***Методыка вывучэння рухаў класічнага танца***

Працяг работы над развіццём каардынацыі рухаў і замацаваннем матэрыялу. Засваенне методыкі вывучэння тэхнікі паваротаў у экзерсісе ля станка і на сярэдзіне зала. Пачатак вывучэння піруэтаў, заносак. Развіццё выразнасці і музыкальнасці выканання як асобных рухаў, так і ў камбінацыях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Экзерсіс ля станка*

**1.** Малыя і вялікія позы croisée, effacée, ecartée, II, IV arabesqués – выконваюцца на ўсёй ступні і на паўпальцах.

**2**. Grand-plié з port de bras (працуюць толькі рукі, без корпуса).

**3**. Battement tendu: а) ва ўсіх малых і вялікіх позах; б) pour batterie.

**4**. Battement tendu jeté ва ўсіх малых і вялікіх позах.

**5**. Demi rond і rond de jambe на 45° на demi-plié і на паўпальцах.

**6.** Battement fondu, double fondu на паўпальцах на 45°, 90° en face і ў позах.

**7**. Battement soutenus на 90° на ўсёй ступні і на паўпальцах.

**8**. Battemen frappé, double frappé ў позах на паўпальцах.

**9**. Petit battements sur le cou-de-pied на паўпальцах.

**10**. Flic-flac en face.

**11**. Pas tombé з прасоўваннем: а) наском у падлогу; б) на 45°.

**12.**Rond de jambe en на паўпальцах, з заканчэннем у demi-plié.

**13**. Battement relevé lent і battement developpé en face, у позах на паўпальцы.

**14**. Grand rond de jambe developpé на ўсёй ступні і на паўпальцах.

**15.** Grand battement jeté: а) у позах; б) з passé par terre; в) на паўпальцах.

**16**. Паварот fouetté en dehors et en dedans на 1/4 і 1/2 круга з позы ў позу з наском на падлозе на выцягнутайназе і на demi-plié.

**17**. Preparation да pirouette sur le cou-de-pied; Pirouette з V пазіцыі.

**18.** Soutenu en tournant en dehors et en dedans 1/2 і цэлы паварот, пачынаючы наском у падлогу і на 45°.

**19**. Паўпавароты на адной назе: а) працуючая нага ў становішчы sur le cou-de-pied; б) з падменай выцягнутай нагі на ўсёй ступні і на паўпальцах.

*Экзерсіс на сярэдзіне зала*

**1.** Поза IV arabesque з нагой, паднятай на 45° і 90°.

**2.** Grand-plié з port de bras (працуюць толькі рукі, без корпуса).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**3**. Battement tendu, Battement tendu jeté en tournant па 1/8 і 1/4 круга, па 1/2 круга.

**4**. Battement tendu jeté balançoir en face і ў позах.

**5**. Battement fondu, double fondu на ўсёй ступні, на паўпальцах en face і ў позах.

**6.** Battement soutenu на 90° en face і ў позах, на ўсёй ступні.

**7.** Battement frappé, double frappe на паўпальцах, з заканчэннем у demi-plié.

**8.** Petit battement sur le cou-de-pied: а) на паўпальцах; б) з plié-relevé на ўсёй ступні.

**9** Pas tombé з прасоўваннем, наском у падлогу і на 45°.

**10.** Petit temps relevé на 45° en dehors et en dedans на паўпальцах.

**11**. Battement relevé lent, battement developpé ў позах на паўпальцы.

**12.** Demi et Grand rond de jambe developpé en dehors et en dedans en face і ў позы.

**13.** Temps lié на 90° en dehors et en dedans з пераходам на ўсю ступню.

**14** Port de bras: а) IV і V port de bras; б) V port de bras з нагой, выцягнутай на насок уперад; в) III port de bras з нагой, назад на plié (з расцяжкай).

**15.** Pas de bourrée ballotté наском у падлогу, на 45°, en tournant.

**16.** Pas de bourrée desus-desous en face.

**17**. Pas de bourrée simple (з пераменай ног) en tournant en dehors et en dedans.

**18**. Preparation да pirouette, Pirouette sur le cou-de-pied з V, II і IV пазіцый.

**19**. Soutenu en tournant en dehors et en dedans на 1/2 і поўны паварот.

**20**. Pas glissade en tournant en dehors et en dedans на 1/2 павароту.

**21**. Паварот fouetté en dehors et en dedans на 1/8, 1/4, 1/2 круга з наском на падлозе з позы ў позу на выцягнутайназе і на demi-plié.

*Allegro*

**1.** Temps leve sauté ў V пазіцыі з прасоўваннем уперад, убок і назад.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**2**. Petit et grand pas echappé: а) па II і IV пазіцыях; б) з заканчэннем на адну нагу.

**3.** Pas assemblé, double assemblé ў позах.

**4.** Pas de basque ўперад і назад.

**5**. Petit pas jeté з прасоўваннем у малыя позы з нагой sur le cou-de-pied.

**6**. Sissonne tombé ў позах.

**7**. Petit pas de chat на 45° з выкідам ног уперад і назад.

**8**. Sissonne ouverte par developpé на 45° у позах.

**9**. Pas failli ўперад і назад.

**10** Temps levé: а) з нагой у становішчы sur le cou-de-pied; б) з нагой на 45°.

**11**. Pas emboîté з пад'ёмам нагі на 45° на месцы і з прасоўваннем.

**12**. Petit et grand pas echappé на II пазіцыю en tournant па 1/4 і 1/2 абароту.

**13**. Changememnt de pied en tournant на 1/4 і на 1/2 абароту.

**14**. Pas balancé en tournant па 1/4 і на 1/2 абароту, у позах.

**15**. Temps lié sauté ўперад і назад (Sissonne tombé).

**16**. Temps levé ў позах I і II, III arabesques (сцэнічны sissonne).

**17**. Pas coupé-ballonné: а) pas ballonné ўбок en face; б) у позах.

**18**. Tours en l'air (changement de pied en tournant на поўны абарот).

## Раздзел III

### *Тэма 6. Аналіз літаратуры па методыцы выкладання класічнага танца*

Структура і змест падручнікаў і вучэбна-метадычных дапаможнікаў, іх мэты і задачы, прымяненне ў вучэбным працэсе.

Уклад В. Кастравіцкай, А. Пісарава, Н. Базаравай, В. Мей, Н. Тарасава ў развіццё тэорыі і методыкі выкладання класічнага танца.

Кніга «Класічны танец» Н. Тарасава была выдадзена ў 1971 г. для школы мужчынскага выканальніцтва (для будучых



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

педагогаў харэаграфічных факультэтаў). У сваім падручніку Н. Тарасаў паслядоўна і падрабязна распавядае аб складаным працэсе выхавання танцоўшчыка. Праца Н. Тарасова з'яўляецца найкаштоўнейшым укладам у тэорыю і практыку харэаграфічнага мастацтва, і будзе спрыяць яго далейшаму развіццю.

«Азбука класічнага танца» Н. Базаравай, В. Мей. Кніга прызначана для педагогаў-пачаткоўцаў і ахоплівае першыя тры гады навучання класічнаму танцу – гэта ўвесь пачатковы этап балетнай адукацыі. Аўтары размеркавалі паслядоўнасць вывучэння рухаў па класах, кожнаму руху далі вобразную характарыстыку і першапачатковую вучэбную раскладку з падрабязным тлумачэннем методыкі выканання кожнага руху.

«Школа класічнага танца» В. Кастравіцкай, А. Пісарава. Падручнік і дадзеная праца, складзеная па вучэбнай праграме мужчынскага і жаночага класічнага танца. Кожны рух разглядаецца ў яго эвалюцыі ад простай да скончанай складанай формы.

«Класічны танец» В. Лысянковай. У 2011 г. выдадзены навучальны дапаможнік па курсе вывучэння дысцыпліны «Класічны танец». У кнізе выкладаюцца асновы класічнага танца. Кожны год уключае матэрыялы для лекцыйных заняткаў і асноўную практычную частку. Выданне прызначана для педагогаў класічнага танца, навучэнцаў і студэнтаў навучальных устаноў.

### *Тэма 7. Педагагічная сістэма А. Я. Ваганавай у развіцці і станаўленні школы класічнага танца*

Студэнты знаёмяцца з педагагічнай сістэмай прафесара А. Я. Ваганавай, яе ўкладам у развіццё тэорыі і методыкі выкладання класічнага танца. Стварэнне тэорыі класічнага танца. Новая методыка выкладання класічнага танца, якая ўвабрала ў сябе ўсё лепшае з айчыннай школы класічнага танца. Асноўная тэарэтычная праца А. Я. Ваганавай – падручнік «Асновы класічнага танца».

### ***Методыка вывучэння рухаў класічнага танца***

Асноўнымі задачамі работы з'яўляюцца метадычна правільная пабудова камбінацый класічнага танца ў адпаведнасці з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музычным матэрыялам, уменне адпрацаваць з выканаўцамі тэхніку, выразнасць, характар і манеру камбінацыі або варыяцыі. На практычных занятках працягваецца работа па вывучэнні вярчэнняў, ускладненай формы adagio, заносак, вялікіх скачкоў, вядзецца работа па развіцці каардынацыі рухаў.

*Экзерсіс ля станка*

**1.** Battement fondu на 90° у позах на паўпальцах.

**2.** Battement double frappé з паваротам на 1/4 і 1/2 круга на паўпальцах.

**3.** Battement battu sur le cou-de-pied уперад і назад en face і épaulement.

**4.** Flic-flac en tournant en dehors et en dedans (у 6-м семестры).

**5.** Rond de jambe en l'air en dehors et en dedans з plié-relevé на паўпальцах.

**6.** Battements relevé lent і battement developpé en face і ў позах: а) на паўпальцах; б) з plié-relevé et demi rond de jambe з позы ў позу.

**7.** Battement developpé: а) ballotté; б) tombé en face; в) у позах.

**8.** Grands battements jeté: а) developpé (мяккі); б) balançoir; в) passé на 90°.

**9.** Паварот fouetté en dehors et en dedans на 1/8, 1/4, 1/2 абароту з нагой на 90°.

**10.** Паўпаварот з позы ў позу праз passé на 45°, 90°, на паўпальцах і з plié-relevé.

**11.** Pirouette en dehors et en dedans з temps-relevé на 45°.

*Экзерсіс на сярэдзіне зала*

**1.** Rond de jambe par terré en tournant па 1/4 і 1/2 круга.

**2.** Battement fondu: а) на 90° en face і ў позах; б) en tournant па 1/2 круга на 45°.

**3.** Battement soutenu на 90° en face і ў позах на паўпальцах.

**4.** Battement frappé, double frappé: а) у позах на паўпальцах; б) en tournant па 1/2 круга.

**5.**Battement developpé tombé ў позах, наском у падлогу і на 90°.

**6.** Tours lent en dehors et en dedans: а) у вялікіх позах; б) з позы ў позу.

**7.** Grand battement jeté: а) developpé (мяккі) en face і ў позах; б) passé на 90°.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**8.** VI port de bras.

**9.** Pas de bourrée dessus-dessou en tournant en dehors et en dedans.

**10.** Temps lié par terre з pirouette en dehors et en dedans.

*Allegro*

**1.** Entrechat-quatre. Royale.

**2.** Pas echappé battu. Pas echappé battu з заканчэннем на адну нагу.

**3.** Pas assemblé battu. Double assemblé battu.

**4.** Entrechat-trois. Entrechat-cinq.

**5.** Pas brisé ўперад, назад.

**6.** Grande sissonne ouverte par developpé ў позах.

**7.** Pas emboîté en tournant убок, па дыяганалі.

**8.** Sissonne simple en tournant на 1/2 круга en dehors et en dedans.

**9.** Sissonne ouverte en tournant на 1/2 круга en dehors et en dedans.

**10.** Sissonne tombé en tournant на 1/2 круга en dehors et en dedan.

**11.** Sissonne fermé en tournant на 1/2 абароту.

**12.** Pas ballotté наском у падлогу і на 45°.

**13.** Grande pas assemblé з прыёмаў: pas glissade, sissonne tombé, pas chassé.

## Раздзел IV

### *Тэма 8. Метадычныя прыёмы ў пастаноўцы рук на ўроках класічнага танца*

Склад рухаў класічнага танца вялікі і разнастайны, але асноўная яго «моўная адзінка» – гэта поза ва ўсёй сваёй харэаграфічнай і кампазіцыйнай разнастайнасці. Яна дае мастацтву класічнага танца стройныя, ёмістыя, гнуткія сродкі выразнасці. Поза класічнага танца адрозніваецца выключнай разнастайнасцю прыёмаў выканання. Яна можа ўваходзіць як асноўны або як дадатковы элемент у той ці іншы рух. Поза можа быць выканана ў малой ці вялікай форме, на падлозе (par terre) і ў паветры (en l'air), без павароту і з паваротам, з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кручэннем, з заноскай і г. д. Позы могуць злучацца адна з другой у адзіную харэаграфічную кампазіцыю пры дапамозе розных прыёмаў сувязі.

Асаблівасці методыкі работы выкладчыка пры вывучэнні пастаноўкі рук на ўроках класічнага танца (пры вывучэнні поз і форм port de bras).

*Тэма. 9. Сучасны ўзровень развіцця аматарскага мастацтва*

Фарміраванне прафесійнага інтарэсу і выхавання самастойнай творчасці. У апошні год навучання студэнты ўдасканальваюць свае веды не толькі на ўроках класічнага танца, але і падчас педагагічнай практыкі. Яна праводзіцца ў школах мастацтваў, вучылішчах мастацтваў, у самадзейных і прафесійных калектывах народнага танца, у калектывах мастацкай самадзейнасці з эстрадным, спартыўным, бальным напрамкамі.

***Методыка вывучэння рухаў класічнага танца***

Удасканальванне пройдзенага матэрыялу і засваенне методыкі вывучэння новых рухаў. Работа над рухамі групы скачкоў, асабліва над вялікімі скачкамі.

*Экзерсіс ля станка*

**1.** Double rond de jambe en l'air en dehors et en dedans на паўпальцах.

**2.** Rond de jambe en l'air sauté en dehors et en dedans.

**3.** Battement developpé з кароткім balancé.

**4.** Grand temps relevé на 90° en dehors et en dedans.

**5.** Grand battement jeté з паваротам fouetté на 1/4 і 1/2 абароту.

**6.** Grand battemens jeté з demi-rond en dehors et en dedans.

**7.** Pirouette en dehors et en dedans пачынаючы з адкрытай нагі ўбок.

**8.** Tour fouetté на 45° en dehors et en dedans.

*Экзерсіс на сярэдзіне зала*

**1.** Battement battu sur le cou-de-pied уперад і назад en face і épaulement.

**2.** Flic-flac en tournant en dehors et en dedans з заканчэннем у V і IV пазіцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**3.** Double rond de jambe en l’air на 45° en dehors et en dedans на паўпальцах.

**5.** Battement developpé ballotté ў вялікія позы.

**6.** Grand temps relevé на 90° en face en dehors et en dedans.

**7.** Grand fouetté с effacée na efface.

**8.** Grand effacée з шагам на croisé.

**9.** Pirouette en dehors et en dedans з pas echappé з II і IV пазіцыі.

**10.** Tours fouetté на 45° en dehors.

**11.** Renversé у attitude en dehors et en dedans.

**12.** Pirouette en dehors з degagé па дыяганалі.

**13.** Pirouette en dedans з coupé-шагам па дыяганалі.

**14.** Tours chaîné па дыяганалі.

*Allegro*

**1.** Pas assemblé en tournant па 1/4 і 1/2 абароту.

**2.** Rond de jambe en l'air sauté en dehors et en dedans.

**3.** Grand pas de chat па дыяганалі, па крузе.

**4.** Temps levé ў позах на 90° (Grand sisonne ouverte у I arabesque).

**5.** Pas cabriole на 45° з прыёмаў: coupé-шаг, pas glissade, sissonne tombé.

**6.** Sissonne simple en tournant en dehors et en dedans па поўным абароце.

**7.** Sissonne ouverte en tournant en dehors et en dedans па поўным абароце.

**8.** Sissonne fermé en tournant на 1/2 абароту.

**9.** Sissonne tombé en tournant en dehors па поўным абароце.

**10.** Pas emboité en tournant з прасоўваннем убок і па дыяганалі.

**11.** Pas brisé уперад, назад, brisé desus-desous.

**12.** Grand pas jeté ўперад у позах attitude croisé, effacée, I, II і III arabesques.

**13.** Pas jeté entrelacé (перакідное jeté).

**14.** Saut de basque па дыяганалі, па крузе.

**15.** Grand fouetté saute en tournant на 1/2 абароту ў attitude croisé.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

*для спецыяльнасці 1-17 02 01 Харэаграфічнае мастацтва (па напрамках), напрамкаў спецыяльнасці 1-17 02 01-04 Харэаграфічнае мастацтва (народны танец), 1-17 02 01-06 Харэаграфічнае мастацтва (эстрадны танец), 1-17 02 01-10 Харэаграфічнае мастацтва (сучасны танец)*

| Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | практычныя заняткі | індывідуальныя заняткі | | |
| **Раздзел I** | | | | | |
| *Тэма 1.* Фарміраванне і развіццё сістэмы класічнага танца | 2 | | | 10 | канспект |
| *Тэма 2.* Асноўныя патрабаванні да класічнага танца | 2 | | | | экзамен |
| *Тэма 3.* Развіццё музыкальнасці на ўроку класічнага танца | 2 | | | 10 | апытанне |
| Методыка вывучэння рухаў класічнага танца (практычныя заняткі) | | 74 | 4 | | |
| **Раздзел II** | | | | | |
| *Тэма 4.* Прынцыпы падбору музычнага матэрыялу да ўрока класічнага танца | 2 | | | 10 | пісьмовае апытанне |
| *Тэма 5.* Этапы пабудовы ўрока класічнага танца ў аматарскім калектыве | 2 | | | 10 | пісьмовае апытанне |
| Методыка вывучэння рухаў класічнага танца (практычныя заняткі) | | 50 | 4 | | |
| **Раздзел III** | | | | | |
| *Тэма 6.* Аналіз літаратуры па методыцы выкладання класічнага танца | 2 | | | 10 | пісьмовае апытанне |
| *Тэма 7.* Педагагічная сістэма А. Я. Ваганавай у развіцці і станаўленні школы класічнага танца | 2 | | | 12 | апытанне |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Методыка вывучэння рухаў класічнага танца (практычныя заняткі) | | 66 | 4 | | экзамен |
| **Раздзел IV** | | | | | |
| *Тэма 8.* Метадычныя прыёмы ў пастаноўцы рук на ўроках класічнага танца | 2 | | | 10 | апытанне |
| *Тэма 9.* Сучасны ўзровень развіцця аматарскага мастацтва | 4 | | | 18 | апытанне |
| Методыка вывучэння рухаў класічнага танца (практычныя заняткі) | | 90 | 6 | | экзамен |
| **Усяго…** | **20** | **280** | **18** | **90** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

*для спецыяльнасці 1-17 02 01 Харэаграфічнае мастацтва, напрамку спецыяльнасці 1-17 02 01-05 Харэаграфічнае мастацтва (бальны танец)*

| Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | практычныя заняткі | індывідуальныя заняткі | | |
| **Раздзел I** | | | | | |
| *Тэма 1.* Фарміраванне і развіццё сістэмы класічнага танца | 1 | | | 8 | канспект |
| *Тэма 2.* Асноўныя патрабаванні да класічнага танца | 1 | | | | экзамен |
| *Тэма 3.* Развіццё музыкальнасці на ўроку класічнага танца | 2 | | | 6 | апытанне |
| Методыка вывучэння рухаў класічнага танца (практычныя заняткі) | | 48 | 4 | | |
| **Раздзел II** | | | | | |
| *Тэма 4.* Прынцыпы падбору музычнага матэрыялу да ўрока класічнага танца | | | | 6 | пісьмовае апытанне |
| *Тэма 5.* Этапы пабудовы урока класічнага танца ў аматарскім калектыве | 1 | | | 6 | пісьмовае апытанне |
| Методыка вывучэння рухаў класічнага танца (практычныя заняткі) | | 48 | 4 | | |
| **Раздзел III** | | | | | |
| *Тэма 6.* Аналіз літаратуры па методыцы выкладання класічнага танца | | | | 8 | пісьмовае апытанне |
| *Тэма 7.* Педагагічная сістэма А. Я. Ваганавай у развіцці і станаўленні школы класічнага танца | 1 | | | 10 | апытанне |
| Методыка вывучэння рухаў класічнага танца (практычныя заняткі) | | 56 | 4 | | залік |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Раздзел IV** | | | | | |
| *Тэма 8.* Метадычныя прыёмы ў пастаноўцы рук на ўроках класічнага танца | | | | 8 | канспект |
| *Тэма 9.* Сучасны ўзровень развіцця аматарскага мастацтва | | | | 14 | канспект |
| Методыка вывучэння рухаў класічнага танца (практычныя заняткі) | | 84 | 6 | | экзамен |
| **Усяго…** | **6** | **236** | **18** | **66** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


1. *Базарова, Н. П.* Азбука классического танца : первые три года обучения : учеб. пособие / Н. П. Базарова, В. П. Мей. – Изд. 3-е, испр. и доп. – СПб. : Лань, 2006. – 239 с., 32 с. фот. : ил. ; То же [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://e.lanbook.com/book/72999. – Дата доступа: 23.03.2017.

2. *Базарова, Н. П.* Классический танец : методика четвертого и пятого года обучения : учебник для высш. и средн. спец. учеб. заведений искусств и культуры / Н. П. Базарова. – 2-е изд., испр. – Л. : Искусство, 1984. – 207 с. : ил.

3. Балет : энциклопедия / редкол.: Ю. Н. Григорович [и др.]. – М. : Сов. энцикл., 1981. – 623 с. : ил. ; То же [Электронный ресурс]. – Электрон. текст., граф. дан. и прогр. (322 Мб). – М. : ДиректМедиа Паблишинг, 2008. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM).

4. *Березова, Г. А.* Классический танец в детских хореографических коллективах / Г. А. Березова. – Київ : Музична Україна, 1979. – 260 с. : ил.

5. *Ваганова, А. Я.* Основы классического танца : учебник для вузов и ссузов искусства и культуры / А. Я. Ваганова. – Изд. 9-е, стер. – СПб. : Лань, 2007. – 192 с. : ил. ; То же [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://e.lanbook.com/book/1937. – Дата доступа: 23.03.2017.

6. *Головкина, С. Н.* Уроки классического танца в старших классах / С. Н. Головкина. – М. : Искусство, 1989. – 150 с.

7. *Домарк, В. Ю.* Классический танец. Размышления балетного педагога. Мастер-класс мужского театрального урока : учеб. пособие / В. Ю. Домарк. – СПб. : Лань : Планета музыки, 2010. – 128 с. ; То же [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://e.lanbook.com/book/1947. – Дата доступа: 23.03.2017.

8. *Есаулов, И. Г.* Педагогика и репетиторство в классической хореографии / И. Г. Есаулов. – СПб. : Лань : Планета музыки, 2015. – 256 с. ; То же [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://e.lanbook.com/book/63599. – Дата доступа: 23.03.2017.

9. *Есаулов, И. Г.* Устойчивость и координация в хореографии / И. Г. Есаулов. – СПб. : Лань : Планета музыки, 2017. –


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

160 с. ; То же [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://e.lanbook.com/book/90846. – Дата доступа: 23.03.2017.

*10. Костровицкая, В. С.* 100 уроков классического танца (с 1 по 8 класс) : учеб.-метод. пособие для хореографических училищ / В. Костровицкая. – 2-е изд., доп. – Л. : Искусство, 1981. – 265 с. : ил.

*11. Костровицкая, В. С.* Школа классического танца : учебник для хореографических училищ и хореографических отделений вузов искусств и культуры / В. Костровицкая, А. Писарев. – Изд. 3-е, испр. – Л. : Искусство, 1986. – 269 с. : ил.

*12. Лысенкова, В. В.* Классический танец : учеб. пособие для учащихся ссузов по специальности «хореографическое искусство» / В. В. Лысенкова. – Минск : Паркус плюс, 2011. – 489 с. : ил.

*13. Мессерер, А.* Уроки классического танца / Асаф Мессерер. – СПб. ; М. ; Краснодар : Лань, 2004. – 400 с. : ил.

*14. Сапогов, А. А.* Школа музыкально-хореографического искусства / А. А. Сапогов. – СПб. : Лань : Планета музыки, 2014. – 264 с. ; То же [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://e.lanbook.com/book/49477. – Дата доступа: 23.03.2017.

*15. Сафронова, Л. Н.* Уроки классического танца / Л. Н. Сафронова. – СПб. : Лань : Планета музыки, 2015. – 192 с. ; То же [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://e.lanbook.com/book/58834. – Дата доступа: 23.03.2017.

*16. Тарасов, Н. И.* Классический танец. Школа мужского исполнительства : учеб. пособие / Н. И. Тарасов. – Изд. 4-е, стер. – СПб. ; М. ; Краснодар : Лань : Планета музыки, 2008. – 509 с. : ил. ; То же [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://e.lanbook.com/book/79347. – Дата доступа: 23.03.2017.

*17. Ярмолович, Л.* Принципы музыкального оформления урока классического танца / Л. Ярмолович. – М. : Искусство, 1968 – 68 с.

*Дадатковая*

*1. Звездочкин, В. А.* Классический танец : учеб. пособие для студентов высш. и средн. учеб. заведений искусств и культуры / В. А. Звездочкин. – 2-е изд., испр. и перераб. – Ростов н/Д : Феникс, 2005. – 410 с. : ил. ; То же [Электронный ресурс]. –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Режим доступа: http://e.lanbook.com/book/1949. – Дата доступа: 23.03.2017.

*2.* Классический танец в самодеятельном коллективе : метод. пособие / Респ. науч.-метод. центр культуры ; сост. Г. А. Черноярова. – Минск : [б. и.], 1989. – 35 с.

*3.* Классический танец: практ. уроки для студентов отделения хореографии : метод. пособие / С.-Петерб. гос. акад. культуры. Кафедра хореографии ; отв. ред. Б. Я. Брегвадзе. – СПб. : [б. и.], 1995. – 82, [1] с.

*4. Лукьянова, Е. А.* Дыхание в хореографии : учеб. пособие / Е. А. Лукьянова. – СПб. : Лань : Планета музыки, 2017. – 184 с. ; То же [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://e.lanbook.com/book/91848. – Дата доступа: 23.03.2017.

*5. Малашевская, Е. А.* Классический танец. Мастер-класс балетного урока / Е. А. Малашевская, Н. А. Александрова. – СПб. : Лань : Планета музыки, 2014. – 64 с. + 1 электрон. опт. диск (DVD) ; То же [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://e.lanbook.com/book/50692. – Дата доступа: 23.03.2017.

*6. Меднис, Н. В.* Введение в классический танец / Н. В. Меднис, С. Г. Ткаченко. – СПб. : Лань : Планета музыки, 2017. – 60 с. ; То же [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://e.lanbook.com/book/90839. – Дата доступа: 23.03.2017.

*7.* Методическое пособие по классическому танцу / Могилевск. гос. ун-т им. А. А. Кулешова ; сост. Г. А. Хруцкая. – Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2007. – 45, [3] с. : ил.

*8. Мориц, В. Э.* Методика классического тренажа / В. Э. Мориц, Н. И. Тарасов, А. И. Чекрыгин. – СПб. : Лань : Планета музыки, 2017. – 224 с. ; То же [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://e.lanbook.com/book/91053. – Дата доступа: 23.03.2017.

*9. Руднева, Л. В.* Музыкальное сопровождение к уроку классического танца / Л. В. Руднева. – СПб. : Лань : Планета музыки, 2013. – 72 с. ; То же [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://e.lanbook.com/book/37003. – Дата доступа: 23.03.2017.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Рэкамендаваныя сродкі дыягностыкі і кантролю

Для дыягностыкі прафесійнай кампетэнцыі, выяўлення ўзроўню навучальных дасягненняў студэнтаў рэкамендуецца выкарыстоўваць наступны інструментарый:

1. Комплексныя align="center" розназўзроўневыя заданні:

– паняцце асновы харэаграфіі і яго складаная частка ў розных напрамках танца;

– вывучэнне асноўных правіл пабудовы ўрока і яго правядзення пад кіраўніцтвам выкладчыка.

2. Вуснае і пісьмовае (тэсціраванне) апытанне студэнтаў.

3. Пісьмовая распрацоўка плана-праекта па аналізе літаратуры і зместу метадычных распрацовак па класічным танцы.

4. Пісьмовая распрацоўка па рабоце выкладчыка ў класе, яго мэты і задачы пры навучанні класічнаму танцу.

5. Фарміраванне прафесійнага інтарэсу і выхаванне самастойнага падыходу да творчасці.

## Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў

У якасці самастойнай работы студэнтаў прапаноўваюцца наступныя формы заданняў: састаўленне канспекта па тэмах лекцыйных заняткаў у адпаведнасці з вучэбным планам дысцыпліны; падрыхтоўка да вусных і пісьмовых апытанняў па тэмах лекцыйных і практычных заняткаў у адпаведнасці з вучэбным планам дысцыпліны.

## Прыкладны пералік заданняў для кантралюемай самастойнай работы

1. «Фарміраванне і развіццё сістэмы класічнага танца» / «Працы П. Бошана і Р. Фее ў французскай каралеўскай акадэміі танца» – канспект (па выбары)

***2. «Развіццё сістэмы класічнага танца ў Расіі» – канспект***

3. «Асноўныя патрабаванні да класічнага танца» – апытанне па тэме

4. «Развіццё музыкальнасці на ўроку класічнага танца» – канспект

5. «Педагагічнае майстэрства прафесара А. Я. Ваганавай» – канспект

6. «Аналіз літаратуры па методыцы выкладання класічнага танца» – канспект

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. «Метадычныя прыёмы ў пастаноуцы рук на ўроках класічнага танца» – апытанне

8. «Сучасны ўзровень развіцця аматарскага мастацтва» / «Фарміраванне прафесійнага інтарэсу і выхавання самастойнай творчасці» – канспект (па выбары)

**Індывідуальныя занятк**і

На індывідуальных занятках студэнты складаюць і паказваюць асобныя камбінацыі ля станка з тлумачэннем методыкі вывучэння рухаў і правіл іх выканання.

**Пералік заданняў для індывідуальных заняткаў**

Прынцыпы і значэнне састаўлення камбінацый па праграме (разбор і аналіз камбінацый, дадзеных педагогам).

Формы маленькага і вялікага adagio, прынцып састаўлення adagio.

Запіс і разбор камбінацый з урока, якія састаўлены студэнтамі.

Прыёмы, правілы, тэхніка выканання рухаў групы pirouettes.

Групы скокаў, іх дзяленне, тэхніка выканання ў разделе allegro.

Складанне вучэбнай камбінацыі з раздзела allegro, на пройдзеным матэрыяле, з прыёмамі, тэхнікай выканання, на прапанаваны музычны фрагмент.

Стварэнне плана ўрока па класічным танцы для калектываў рознага напрамку (эстраднага, бальнага, сучаснага танца).

Прыёмы работы над удасканальваннем педагагічнага майстэрства. (Складанне ўрока, методыка вывучэння рухаў, прыёмы выразнасці і музыкальнасці выканання рухаў, падыходы і тэхнічнае выкананне складаных рухаў на ўсіх раздзелах урока.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**КЛАСІЧНЫ ТАНЕЦ**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-17 02 01 Харэаграфічнае мастацтва (па напрамках),*
*напрамкаў спецыяльнасці*
*1-17 02 01-04 Харэаграфічнае мастацтва (народны танец),*
*1-17 02 01-05 Харэаграфічнае мастацтва (бальны танец),*
*1-17 02 01-06 Харэаграфічнае мастацтва (эстрадны танец),*
*1-17 02 01-10 Харэаграфічнае мастацтва (сучасны танец)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2019. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,69. Ул.-выд. арк. 1,05. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ